**АСТА́ТАК**, тып вуглавога злучэння сцен зрубнай канструкцыі, пры якім круглыя ці брусковыя бярвёны сумежных сцен з рытмічным чаргаваннем насцілаюцца адзін на адзін такім чынам, што іх канцы выходзяць па-за межы аб'ёму пабудовы. Шырока выкарыстоўваўся ў бел. нар. дойлідстве 19 — пач. 20 ст. пры будаўніцтве жылля, клецяў, свірнаў, корчмаў, культавых пабудоў. Вылучаюцца рэгіянальныя адрозненні злучэння сцен з А. У Паазер'і і цэнтр. Беларусі быў пашыраны вугал з 6- або 8-граннай апрацоўкай А. — «у ахрапку». На Палессі прымянялі і вуглавое злучэнне

сцен з фігурнай апрацоўкай А. — «н
каню».

*Літ.*: Лакотка А.І. Нацыянальны
рысы беларускай архітэктуры. Мінс
1999. *Ю.Ю.Захарын*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ